3. Агибалова, С. В. Духовно-нравственное воспитание на уроках русского языка и литературы как основа формирования общечеловеческих ценностей / С. В. Агибалова // Молодой ученый. – 2015. – № 2 (82). – С. 468–471.

*УДК 378.096:27-67:378.4(476.2)*
***С. А. Чаропка***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

## ГРАМАДСКАЯ КАФЕДРА ХРЫСЦІЯНСКАЙ КУЛЬТУРЫ ГДУ ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ: ВОПЫТ ДЗЕЙНАСЦІ

Рэлігійны светапогляд з'яўляецца адной з самых старажытных формаў чалавечага разумення навакольнага свету. У XX ст., у сілу пэўных гістарычных прычын і звязаных з імі працэсаў трансфармацыі грамадства, Царква стала губляць уплыў у грамадстве. Аднак з канца XX ст. ва Усходняй Еўропе адбываецца своеасаблівы рэлігійны «рэнесанс», які характарызуецца запавольваннем працэсаў секулярызацыі грамадства і ўзрастаннем ролі рэлігійных арганізацыі ў каштоўнастных арыенцірах чалавека, яго духоўным, культурным і сацыяльным жыцці.

У 1990 г. быў прыняты закон "аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях", які гарантаваў свабоду веравызнання ў СССР. Адбылася актывізацыя рэлігійнага жыцця, адраджэнне і будаўніцтва новых храмаў, вяртанне царкве канфіскаванай уласнасці. У канцы 80-х гг. XX ст. у Беларусі пачаўся працэс станаўлення арганізацыйных структур шэрагу рэлігійных арганізацый. Найбольш маштабна праходзіў працэс адраджэння Праваслаўнай царквы. Калі ў 1989 г. дзейнічала 477 прыходаў, то у канцы 1990 г. – ужо больш за 660. У 1989 г. Архіерэйскі сабор Рускай праваслаўнай царквы прыняў рашэнне аб утварэнні Беларускага экзархату, у сувязі з чым пачаўся працэс фарміравання Беларускай праваслаўнай царквы.

Важным этапам у адраджэнні праваслаўнай духоўнасці стала падпісанне ў 2003 г. пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквой. У пагадненні адзначалася, што «...развіццё і ўмацаванне супрацоўніцтва дзяржавы і царквы адпавядаюць інтарэсам беларускага народа»[1]. Высокую ацэнку ролі БПЦ у жыцці беларускага грамадства даў А.Р. Лукашэнка. 25 верасня 2009 г. Прэзідэнт адзначыў: «Теперь очень важно продолжить взаимодействие государства и Церкви по укреплению моральных устоев общества, сохранению культурного наследия и развитию социального служения. Белорусы, познавшие цену войн и бедствий, никогда не изменят единству славянских народов, основанному на православных традициях и культуре» [2].

Супрацоўніцтва ГДУ імя Ф. Скарыны з Праваслаўнай царквой пачалося яшчэ на рубяжы XX-XXI ст. У 2010 г. адбылася першая сумесная канферэнцыя "Праваслаўе на Гомельшчыне: гісторыка-культурная спадчына і сучаснасць", якая выклікала цікавасць як з боку прафесійных гісторыкаў і прадстаўнікоў духавенства, так і з боку шырокіх слаёў грамадства. Сістэмнае супрацоўніцтва пачалося 10 студзеня 2012 г., калі архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Арыстарх і рэктар А. В. Рагачоў падпісалі праграму супрацоўніцтва на 2011–2014 гады. Праграма прадугледжвала шырокі спектр мерапрыемстваў, каардынуючым павінна была выступаць ствараемая гэтым пагадненнем грамадская кафедра хрысціянскай культуры.

Паспяховая практыка рэалізацыі праграмы запатрабавала пралангацыі гэтага супрацоўніцтва і 10 студзеня 2014 года адбылося падпісанне новай праграмы супрацоўніцтва на 2015-2020 гг. У рамках правядзення ў жыццё палажэнняў гэтай праграмы з 2014 г. традыцыяй стала арганізацыя канферэнцыі "Праваслаўе ў грамадскім жыцці Гомельшчыны", якая стала штогадовай і праводзіцца ў рамках "Свята-Пакроўскіх адукацыйных чытанняў". Канферэнцыя аб'ядноўвае даследчыкаў гісторыі царквы і рэлігіі

з розных вучэбных і навуковых цэнтраў бліжняга і далёкага замежжа. На пачатак 2025 г. выдадзена 7 зборнікаў, у якіх апублікавана больш 200 артыкулаў. Асаблівасцю канферэнцыі з’яўляецца арганізацыя ў яе рамках шэрагу круглых сталоў, а таксама асобнай секцыі для старшакласнікаў, якія абараняюць свае даследаванні перад аўтарытэтным журы. Па выніках канферэнцыі пры падтрымцы Гомельскай епархіі штогод выдаёцца зборнік артыкулаў. Усяго за час правядзення моладзевай секцыі было падрыхтавана больш сотні вучнёўскіх дакладаў.

У рамках навукова-даследчай работы студэнтаў у вобласці вывучэння гісторыі Праваслаўнай царквы ў Беларусі студэнтамі і магістрантамі падрыхтавана больш 30 работ. Для стымулявання навуковай дзейнасці ў гэтым кірунку было распрацавана «Палажэнне аб парадку прызначэння і выплаты Архіерэйскай прэміі» выкладчыкам і «Палажэнне аб парадку прызначэння і выплаты Архіерэйскай Стыпендыі, студэнтам факультэта гісторыі і міжкультурных камунікацый. Па выніках праведзеных даследаванняў лаўрэатамі Архіерэйскай стыпендыі сталі студэнты У. Кулакевіч (2014 г.), Н. Пяўнёва (2015 г.), В. Друзянок (2015 г.), У. Смольскі (2016 г.), А. Казлова (2017 г.), І. Барысенка (2018 г.), А. Кузьмянкова (2019 г.), Д. Дзямідава (2020 г.), А. Краўцова (2021 г.), Г. Дзяцел (2022 г.), І. Папоў (2023 г.), Я. Бондар (2023 г.), В. Раманюк (2024 г.), П. Філон (2024 г.). Лаўрэатамі Архіерэйскай прэміі станавіліся У. П. Пічукоў і А. Д. Лебедзеў (2015 г.), С. А. Чаропка (2016, 2019, 2023 гг.), С. Ф. Верамееў (2017, 2020 г.), А. Р. Яшчанака (2018 г.), В. А. Адзіночанка (2018 г.), М.М. Мязга (2022 г.), С. І. Тыкун (2024 г.).

Акрамя даследчай дзейнасці ўніверсітэтам і епархіяй рэалізуецца велізарны спектр мерапрыемстваў. У выставачнай зале ўніверсітэта штогод праводзіцца Велікодная выстава “Святло праваслаўя”. Суарганізатарам выступаюць аддзел рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі Гомельскай епархіі, фотаклуб “Святло душы”, рэдакцыя часопіса «Сретенье». Экспазіцыя змяшчае каля сотні творчых прац, якія адлюстроўваюць духоўнасць беларускага народа.

Нетыповай, але перспектыўнай формай узаемадзеяння была арганізацыя і правядзенне ў 2016 і 2017 г. праваслаўнага мюзікла “Не забыцца пра Каляды”, наведванне якога выклікала ажыятаж сярод гледачоў. З мэтай папулярызацыі гісторыі духоўнага жыцця беларускага народа сумесна з тэлеканалам «Беларусь 4. Гомель» у 2024 г. падрыхтаваны некалькі перадач з цыкла “Няпростая гісторыя”.

У цяперашні час грамадскай кафедрай хрысціянскай культуры, якая акумулявала ў сабе спецыялістаў у галіне рэлігіязнаўства і гісторыі хрысціянства і святароў Гомельскай епархіі, праводзяцца факультатыўныя заняткі “Гісторыя хрысціянства”, сустрэчы па тэмах: “Свабода чалавека: ілюзіі і рэальнасць”, “Як навучыцца быць шчаслівым”, “Пра Бога і чалавека”, “Што такое царква”, “Хрысціянская этыка і сацыяльна-прававыя адносіны”. Наладжаны экскурсіі ў храмы г. Гомеля, музей Гомельскай епархіі, іншыя знакавыя мясціны.

Актыўныя выкладчыкі і студэнты, якія працуюць у коле дзейнасці грамадскай кафедры хрысціянскай культуры, кіраўнікі структурных падраздзяленняў і прадстаўнікі кіраўніцтва ўніверсітэта за плённае супрацоўніцтва былі адзначаны ўзнагародамі Гомельскай і Тураўскай епархій – Архіерэйскімі граматамі, медалямі св. Іаана Кармянскага, прп. Манефы Гомельскай, свмч. Алексія Лельчыцкага.

Падводзячы вынік, варта адзначыць, што за апошнія амаль 10 гадоў была наладжана і цяпер эфектыўна працуе сістэма ўзаемадзеяння паміж ГДУ імя Ф.Скарыны і Гомельскай епархіяй БПЦ па пытанні фарміравання гарманічна развітай асобы. Аднак, выклікі часу патрабуюць пастаяннага ўдасканалення ўзаемнай дзейнасці абедзвюх структур.

**Літаратура**

1. Соглашение о сотрудничестве между Республикой Беларусь и БПЦ. - [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://exarchate.by/resource/Dir0009/Dir0015/ – Дата доступа: 30.01.2025.

2. Белорусскую православную церковь Лукашенко назвал главным идеологом страны. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://president.gov.by/ru/events/gosudarstvennuju-ideologiju-neobxodimo-stroit-na-fundamente-xristianskix-tsennostej – Дата доступа: 30.01.2025.

***УДК 531.62:531.392***
***С. В. Шалупаев, А. Л. Самофалов, И. А. Гордеенко***
*г. Гомель, ГГУ имени Ф. Скорины*

## ЗАКОНЫ СОХРАНЕНИЯ В МЕХАНИКЕ КАК ПЕРВЫЕ ИНТЕГРАЛЫ УРАВНЕНИЙ ДВИЖЕНИЯ

В школьном учебнике используют следующий методический подход к формированию понятий работы и энергии. Первоначально вспоминают знания о работе, полученные в VII классе ( $A = FS$ ), затем расширяют и уточняют определение механической работы как $A = FS \cdot \cos\alpha$ (только для $F = \text{const}$ и элементарной работы). Выясняют, что работа может быть положительной и отрицательной.

Пусть тело под действием силы $\vec{F}$ совершает элементарное перемещение $d\vec{r}$, тогда

$$dA = F \cdot dr \cdot \cos\alpha, \tag{1}$$

где α – угол между векторами силы $\vec{F}$ и перемещение $d\vec{r}$.

Полная работа на конечном участке траектории равна сумме элементарных работ, то есть интегралу от силы по перемещению:

$$A = \int_r F \cdot dr \cdot \cos\alpha. \tag{2}$$

Работа, обладая свойствами скалярного произведения, будет положительна, если угол между силой и перемещением острый, и отрицательна, если угол тупой. А если сила перпендикулярна перемещению, то работа не совершается. Например, при горизонтальном перемещении вагона сила тяжести работы не совершает.

Уточняем понятие мощности через отношение элементарной работы $dA$ ко времени совершения работы $dt$:

$$P = \frac{dA}{dt} = \frac{\vec{F}d\vec{r}}{dt} = F \cdot V \cdot \cos\alpha,\ [P] = 1 Ватт. \tag{3}$$

Введём понятие кинетической энергии. Пусть тело перемещается под действием силы $\vec{F}$, изменяя скорость от начальной $\vec{V}_1$ до конечной $\vec{V}_2$. Тогда работа этой силы равна:

$$A = \int_r \vec{F} \cdot d\vec{r}. \tag{4}$$

Кинематические соотношения являются следствием второго закона Ньютона и получаются в школе путём его неявного интегрирования с помощью представления перемещения как площади, ограничиваемой осями координат и зависимостью скорости от времени. Данная методика совпадает с подходом, принятым в научной литературе, и одновременно вполне доступна учащимся средней школы.